***А. Р. Самайловіч***
*Навуковы кіраўнік — кандыдат гістарычных навук А. Г. Казак*
*БДЭУ (Мінск)*

# ПРАДСТАЎЛЕНАСЦЬ ОРГАНАЎ ВЫКАНАЎЧАЙ УЛАДЫ РЕСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ У TELEGRAM

Камунікацыя паміж уладай і грамадствам — базавая рэч у працэсе кіравання дзяржавай на ўсіх этапах. У цяперашні час Інтэрнэт з’яўляецца найбольш папулярным сродкам яе правядзення. Усё больш дзяржаўных органаў і структур павялічваюць сваю прысутнасць у інтэрнэт-асяроддзі. Намі была праведзена работа па аналізу Telegram-каналаў цэнтральных органаў выканаўчай улады Рэспублікі Беларусь.

Інфармацыя па колькасці падпісчыкаў прыведзена па стану на 10 красавіка 2023 г. Колькасць публікацый за апошнія 7 дзён лічылася за перыяд з 3 па 9 красавіка 2023 г.

Па выніках праведзенага аналізу высветлілася, што 5 міністэрстваў не маюць Telegram-канала: Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, Міністэрства фінансаў, Міністэрства замежных спраў, Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Міністэрства прамысловасці. Прычына адсутнасці Telegram-канала ў дадзеных структур незразумелая. Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі мае мясцовую прадстаўленнасць у Telegram, напрыклад па раёнах Мінска, але не мае агульнаміністэрскага канала. Міністэрства замежных спраў вядзе актыўную дзейнасць у іншых сацыяльных сетках.

Па колькасці падпісчыкаў лідзіруе Міністэрства ўнутраных спраў (35 498 чал.) [1]. Па колькасці публікацый за тыдзень найбольш актыўным было Міністэрства абароны (108 публікацый) [2]. Вялікая, у параўнанні з іншымі, актыўнасць Міністэрства абароны выклікана праверкай баявой гатоўнасці, якая праводзілася ў час даследавання па загаду кіраўніка дзяржавы.

Сярод дзяржаўных камітэтаў Telegram-каналаў не маюць Дзяржаўны камітэт па маёмасці, Камітэт дзяржаўнай бяспекі, Дзяржаўны мытны камітэт. Трэба адзначыць, што Камітэт дзяржаўнай бяспекі меў свой Telegram-канал, але ён быў заблакаваны.

Найбольшая колькасць людзей падпісана на канал Дзяржаўнага памежнага камітэта — 13 339 чал. [3]. Найбольшую колькасць публікацый за тыдзень мае Дзяржаўны камітэт па стандартызацыі — 42 публікацыі [4]. На яго Telegram-канале публікуецца інфармацыя пра рэчы і тавары, характырыстыкі якіх парушаюць існуючае заканадаўства і продаж якіх забаронены на тэрыторыі краіны.

Такім чынам, органам дзяржаўнага кіравання Рэспублікі Беларусь трэба павялічваць сваю прысутнасць у сацыяльнай сетцы Telegram. Павінна быць вырашана праблема прысутнасці у сацыяльнай сетцы некаторых структур выканаўчай улады. Гэта дапаможа павысіць узровень камунікацыі паміж грамадствам і ўладай, а таксама палепшыць працэс інфармавання грамадзян аб дзяржаўна-палітычным жыцці краіны з афіцыйных крыніц.

**Крыніцы**

1. Официальный Telegram-канал Министерства внутренних дел Республики Беларусь [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://t.me/pressmvd. — Дата доступа: 10.04.2023.

2. Официальный Telegram-канал Министерства обороны Республики Беларусь [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://t.me/modmilby. — Дата доступа: 10.04.2023.

3. Официальный Telegram-канал Государственного пограничного комитета Республики Беларусь [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://t.me/gpkgovby. — Дата доступа: 10.04.2023.

4. Официальный Telegram-канал Государственного комитета по стандартизации [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://t.me/gosstandartby. — Дата доступа: 10.04.2023.